***Ганна Салавей***

# ДА ПЫТАННЯ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ НАРОДНАГА СОННІКА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ

Снамі прынята называць суб'ектыўнае ўспрыманне слыхавых, зрокавых, тактыльных вобразаў, што ўзнікаюць у свядомасці чалавека, які спіць. Усё, што бачыць чалавек у сне, адмыслова адлюстроўвае ўражанні, думкі, мары, перажыванні, падзеі паўсядзённага жыцця. Пры ўзнікненні вобразаў чалавек, які спіць, не ўсведамляе, што ён спіць, і ўспрымае ўсё, што адбываецца з ім у сне як рэальнасць: размаўляе з людзьмі, перажывае, хвалюецца, вырашае праблемы, здзяйсняе пэўныя ўчынкі.

Са старажытных часоў рабіліся спробы выпрацаваць тыпалогію сноў. Назавем некалькі асноўных пазіцый, з якіх падыходзілі да трактоўкі сноў: роля сноў у жыцці людзей; тое, што ўяўляецца ў сне; сімвалічныя ці несімвалічныя вобразы, якія з’явіліся ў сне; асоба ў снах і той рэальны вобраз, які яна абазначае ў жыцці [2, с. 125].

Убачанае ў сне здавалася людзям нейкім патаемным знакам, які трэба было асэнсаваць, разгадаць і які мог выклікаць розныя, часам супрацьлеглыя здагадкі. Вось чаму трактоўкі таго ці іншага сну бываюць шматзначныя, часам вельмі супярэчлівыя. Сны здаваліся своеасаблівым іншасказальным аповедам, тлумачэнне якога прыводзіла да развіцця ў чалавеку алегарычнага, метафарычнага светабачання. Вобразы ўспрымаліся сімваламі, аналагамі пэўных жыццёвых з’яў і здарэнняў. Параўноваючы народныя расшыфроўкі сноў з песеннай паэзіяй, з павер’ямі, можна пераканацца, што ва ўсіх выпадках традыцыйная сімволіка акажацца ці вельмі блізкая, ці нават аднолькавая ў многіх жанрах і відах традыцыйнай духоўнай культуры: «Ды сасніў жа Ясенька ночкай сон дзіўны: /Здэцца, у вароцейках яблынка цвіла, /Ой, цвіла-цвіла – пахілілася, /Віннае яблычка адкацілася… /Як устала чешчанька, разгадала сон: / - Да ўжо твая Гануленька сына радзіла, Парадзіўшы сына сама памёрла…» [1, с.15].

Яблыня ў розных жанрах беларускага фальклору – гэта сімвал жанчыны, маці. Тое ж датычыць прыведзенай песні з матывам сну. У народных празаічных тлумачэннях сноў гэты дэндралагічны вобраз таксама выяўляе жаночую сімволіку. У народных тлумачэннях сноў «Яблынька багата цвітучая – шчасце для жанчыны; сухая, бязлітасная – дрэннае значэнне, недахоп грошаў, бедната, з якой усім змагацца»; «Як сніцца жонке, што яблыка вісіць і ўкрадзеш, то абярэменее» [1, с. 454].

Паводле народных уяўленняў, далёка не ўсім людзям кожную ноч сняцца сны. Як паведаміла В. М. Салавей, жыхарка вёскі Зарэчча Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці, сны сняцца толькі клапатлівым і працавітым людзям. Калі чалавек хвалюецца «за ўсё на свеце», то ў сне перад ім будуць паўставаць гэтыя хваляванні, толькі ў розных вобразах. А калі чалавек бестурботны, спакойны, то «ён вжэ будзет спаць спакойна» [*2]. Традыцыя выпрацавала шэраг прадпісанняў, магічных рэцэптаў, для пазбаўлення ад бясонніцы. Самыя архаічныя з іх актуалізуюць матыў «смерць-сон»: «Сон, кажуць простыя людзі, можна нагнаць, абнесшы вакол дома пяском з магілы самагубцы і высыпаўшы яго з заходняга боку; аднак хто і тады не спіць, ужо не засне» [1, с.333]. Хрысціянскія ўяўленні знайшлі адлюстраванне ў наступным наратыве: «Каб хутчэй заснуць, трэба заўсёды ляжаць на левым баку, менавіта тады цябе будзе абараняць анёл-ахоўнік, які заўсёды стаіць справа, ад благога, нячыстага сну і ахоўваць яго» [*1]. Паводле іншых сведчанняў, «спаннё на правым баку, само па сабе здаровае, але нязручна тым, што так можна прыціскаць анёла ахоўніка, які звычайна стаіць ля чалавека з правага боку. Вельмі небяспечна спаць з адкрытым ротам, праз які ў чалавека могуць увайсці бесы, каб наводзіць дурныя сны і мучыць яго. Калі ўсе людзі ўночы заснуць, начны анёл абыходзіць і лічыць іх. Спыняючыся перад распранутымі, ён гаворыць: «ета – чалавек!», а праходзячы паўз нераспранутых, гаворыць: «Ета – калода», пры гэтых словах нераспрануты звычайна ўздрыгвае. Да таго ж, калі чалавеку не спіцца ад знешняга шуму і галасоў рознай жывёлы (ад сабачага брэху, каровінага рыкання, курынага кудахтання і г. д.), трэба адразу перавярнуць падушку ці тое, што ляжыць пад галавою, на другі бок або проста перамясціць яго [1, с. 334-335].

Існуюць таксама ўяўленні, што «прарочыя» сны пры пэўных умовах могуць не здзейсніцца. Згадаем некалькі спосабаў, якімі, паводле народных уяўленняў, можна пазбавіцца ад здзяйснення благога сну. Так, М. К. Ружыцкая паведаміла, калі табе сніцца дрэнны сон, раніцай ні ў якім разе нельга глядзець у люстэрка, каб ён не здзейсніўся. Абавязкова трэба сказаць: «Куды ноч, туды й сон» ці «Добры сон уваскрэсні, а дрэнны напапалам трэсні» [*1]. «Калі кепскі сон прысніцца (каб не спраўдзіўся), то да трэцяга дня не трэба паказуваць таго сну нікому» [1, с. 335].

Больш за тое, вераць, што «любы благі, злавесны сон можна пераварацiць на добры. Дзеля гэтага трэба адразу ж, прачнуўшыся, пераварацiць на сабе бялізну, пасцель, падушку, накрыўку і, паляжаўшы некаторы час (колькі патрабуецца на паўтор сну ў думках), пакінуць усё ў такім перавернутым выглядзе да наступнага начнога сну [1, с. 335].

У заключэнне хочацца адзначыць, што сны займаюць важнае значэнне у чалавечым жыцці і могуць змяняць яго, незалежна ад таго, прызнаём чалавек гэта ці не. Праз убачаныя ў сне вобразы, якім нярэдка надаецца сімвалічнае значэнне, чалавек намагаецца спасцігнуць разнастайныя рэаліі і незразумелыя з’явы, зазірнуць у сваё будучае, здзейсніць тое, што выходзіць за рамкі яго магчымасцяў. Не ў малой ступені гэта дасягаецца дзякуючы таму, што ў сне чалавек адносна вольны ад абмежаванняў сваіх паўсядзённых пачуццяў, часу, прасторы. Са сказанага, верагодна, вынікае незнікаючая з найстаражытнейшых часоў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

цікавасць да сноў, важнасць народных тлумачэнняў сноў і іх сімволікі ў міфапаэтычных карцінах свету розных культур.

**Заўвагі:**

*1. Запісана аўтарам у в. Дуброўцы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Ружыцкай Марыі Канстанцінаўны, 1946 г. н., мясцовай.

*2. Запісана аўтарам у в. Зарэчча Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Салавей Вольгі Міронаўны 1939 г.н., мясцовай.

Матэрыялы захоўваюцца ў архіве фальклорна-этнаграфічнага архіва вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна».

**Спіс літаратуры:**


1. Зямная дарога ў вырай : Беларускія народныя прыкметы і павер'і. – Кн. 3 / уклад. У.А. Васілевіч. – Мінск : Выш. школа, 2010. – 717 с.
2. Niebrzegowska, S. Polski Sennik Ludowy / S. Niebrzegowska. – Lublin : W-wo uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 1996. – 297 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ